**УДК 339.543(084)**

# СТАНАЎЛЕННЕ МЫТНАГА САЮЗУ БЕЛАРУСІ, КАЗАХСТАНА І РАСІІ Ў РАМКАХ ЕЎРАЗІЙСКАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

***Уладзімір* Ляхоўскі,**
***Вольга* Сашына**

**Уводзіны.** Еўразійская Эканамічная Супольнасць (ЕўрАзЭС) – міжнародная эканамічная арганізацыя, куды ўваходзяць 5 былых савецкіх саюзных рэспублік (Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Расія і Таджыкістан), якія імкнуцца выйсці на больш высокую ступень міждзяржаўнай інтэграцыі – спачатку стварыць мытны саюз, а затым сфарміраваць адзіны рынак. ЕўрАзЭС была створана 10 кастрычніка 2000 г. У 2010 г., дарэчы, арганізацыя будзе адзначаць першыя 10-я ўгодкі свайго існавання. За гэты час на самітах кіраўнікоў дзяржаў-удзельніц Еўразійскай Супольнасці былі выпрацаваны прававая і арганізацыйная асновы для здзяйснення пастаўленых мэт. 27 лістапада 2009 г. у Мінску адбылося юрыдычнае афармленне Мытнага Саюза Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстана і Расійскай Федэрацыі (далей – Мытны Саюз Беларусі, Казахстана і Расіі). Стварэнне мытнага аб'яднання ў фармаце толькі трох дзяржаў ЕўрАзЭС абумоўлена тым, што ўзгаданыя тры краіны найбольш прасунуліся на шляху еўразійскай эканамічнай інтэграцыі. У беларускай сталіцы кіраўнікі гэтых дзяржаў падпісалі пагадненні аб прыняцці Мытнага кодэксу Мытнага Саюза (далей МК МС), Адзінага мытнага тарыфу Мытнага Саюза і шэраг іншых дакументаў. Прыняты Адзіны мытны тарыф Мытнага Саюза ўступіў у сілу 1 студзеня 2010 г., а Мытны Кодэкс Мытнага Саюзу – 1 ліпеня 2010 г. (Рэспубліка Беларусь ратыфікавала апошні дакумент 6 ліпеня г.г.). Аднак на працягу пераходнага перыяду для кожнай краіны-удзельніцы Мытнага Саюзу застануцца выключэнні з «агульных правіл», па якіх захаваецца асобны парадак ўвозу. З увядзеннем адзінага Мытнага кодэкса Мытнага Саюза будзе адменены мытны кантроль на ўнутраных межах адзінай мытнай прасторы – спачатку на беларуска-расійскім участку мяжы, а з 1 ліпеня 2011 г. – на расійска-казахстанскім.

Але і пасля гэтага ў межах Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі яшчэ не хутка будзе створана адзіная эканамічная прастора. У сфармаваным Мытным Саюзе застаецца нямала «выняткаў», якія тычацца імпартных пошлін на аўтамабілі, экспартных пошлін на энерганосьбіты, некаторых пытанняў, якія датычаць нетарыфнага рэгулявання гандлёвых адносін. Не забудземся тут і пра палітыка-эканамічныя наступствы гэтага «асіметрычнага пагаднення», якія штораз нагадаюць пра сябе. Сёння надзвычай важна выявіць ужо існуючыя дэзаінтэграцыйныя фактары на шляху стварэння адзінага еўразійскага агульнага рынку і прадугледзіць з'яўленне новых. У дадзеным артыкуле робіцца спроба прааналізаваць галоўныя напрамкі правядзення адзінай мытнай палітыкі ў рамках Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі і вызначыць тыя праблемы, што існуюць у гэтай сферы.

**Асноўная частка.** У аснове праекта па фарміраванню ЕўрАзЭС палягае сусветная практыка стварэння груп зацікаўленых



Zbornik.indd 14 14.12.2010 23:43:51

краін паўнавартаснай зоны свабоднага гандлю, а ў далейшым стварэння адзінай мытнай (эканамічнай) прасторы. Развіццю гандлёва-эканамічных адносін садзейнічае патэнцыяльна дастаткова ёмісты рынак дзяржаў-удзельніц Еўразійскай Супольнасці, багатая сыравінная база, сумяшчальныя вытворча-тэхнічныя і спажывецкія стандарты, адзіныя тэхнічныя параметры інфраструктуры транспарту і сувязі [3, с. 44].

У гандлі паміж краінамі-сябрамі ЕўрАзЭС павінны быць адменены ранейшыя абмежаванні. Першыя крокі ў гэтым кірунку зроблены. Прынамсі, прынята агульная дзесяцізначная таварная наменклатура знешнеэканамічнай дзейнасці (ТН ЗЭД) ЕўрАзЭС, якая была ўзята за аснову і Камісіяй Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі. Тэхнічныя пытанні, якія будуць забяспечваць дзеянне ТН ЗЭД Мытнага Саюза, ускладзены на Федэральную Мытную Службу і іншыя органы выканаўчай улады Расійскай Федэрацыі. Уводзяцца таксама адзіны прынцып узымання ўскосных падаткаў – па краіне прызначэння, адзіны парадак экспартнага кантролю і механізма прымянення адмысловых абарончых антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер у гандлі краін-удзельніц Мытнага Саюза. Ужо дзейнічае Рэгіянальны вузел сувязі па праваахоўнай рабоце «RILO-Масква», таксама падпісаны Мемарандум аб узаемапаразуменні са Сусветнай мытнай арганізацыяй (СМА/СМС) [2].

На дадзены момант самым актуальным пытаннем з’яўляецца ўвядзенне ў дзеянне Адзінага мытнага тарыфа, які, як ужо адзначалася, пачаў рэалізоўвацца з 1 студзеня 2010 г. У рамках дадзенага тарыфа для Рэспублікі Беларусь тарыфы зніжаны прыкладна па 2 тыс. таварных пазіцый з 11,5 тыс., а па 470 пазіцыях – павышаны. У сукупнасці тарыфы зніжаюцца прыкладна на 1%. Як ужо адзначалася, тарыфы на аўтамабілі і энерганосьбіты з’яўляюцца найбольш праблемнымі для ўзгаднення паміж удзельнікамі Мытнага Саюза [13]. Праблема існуе яшчэ і ў тым, што сябры Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі таксама імкнуцца да ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю (СГА). Далучэнне да СГА прывядзе да наступнай уніфікацыі тарыфаў. На ўзгадненне мытных тарыфаў у рамках Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі значны ўплыў аказваюць дыяметральныя інтарэсы дзяржаўных, буйных прыватных карпарацый і іншых манапалістаў у знешнеэканамічнай дзейнасці ў краінах-удзельніцах інтэграцыйнага аб’яднання. Усё гэта моцна ўскладняе працэс узгаднення Адзінага мытнага тарыфа МС і ў далейшым можа прывесці да сур’ёзных міждзяржаўных спрэчак [15].

Не менш актуальным з’яўляецца рэальнае ўвядзенне ў штодзённую практыку Мытнага кодэкса Мытнага Саюза як наднацыянальнага міжнароднага прававога акта, які рэгламентуе функцыі і парадак функцыянавання мытных органаў ва ўмовах адзінай мытнай тэрыторыі і адзінай мытнай мяжы аб’яднання ў мэтах забеспячэння эканамічных і іншых інтарэсаў дзяржаў-удзельніц Мытнага Саюза [14].

Падчас працы над МК МС распрацоўшчыкі выкарыстоўвалі тэрміналогію і асноўныя палажэнні Кіотскай канвенцыі (у рэдакцыі 1999 г.). Так, касуюцца такія тэрміны, як «мытны рэжым» (замест яго будзе «мытная працэдура»), «мытнае афармленне» («выпуск тавара»). У адпаведнасці з прынятым у лістападзе 2009 г. МК МС, органамі Мытнага Саюза з’яўляюцца мытныя органы дзяржаў-удзельніц гэтага рэгіянальнага блока, у той час, як Камісія Мытнага Саюза (КМС) Беларусі, Казахстана і Расіі – «адзіны пастаянна дзеючы рэгулюючы орган».

У рамках ТК МС ёсць навацыі, якія тычацца пытанняў рэгулявання ўзаемаадносін мытных органаў з удзельнікамі знешнеэканамічнай дзейнасці (ЗЭД). Па-першае, паводле арт. 38 МК МС, уводзіцца інстытут «упаўнаважанага эканамічнага аператара», у дачыненні тавараў і паслуг якога можа здзяйсняцца спрошчаны кантроль пры здзяйсненні мытных працэдур (у ранейшым мытным заканадаўстве Рэспублікі Беларусь яму адпавядаў інстытут «дабрасумленнага ўдзельніка знешнеэканамічнай дзейнасці»). Новымі для нацыянальнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь стануць больш жорсткія ўмовы па ўключэнню ў рэестр мытных прадстаўнікоў, упаўнаважаных эканамічных аператараў і перавозчыкаў. Для першых двух катэгорый удзельнікаў ЗЭД будзе патрабавацца прадстаўленне абавязацельстваў па аплаце мытных пошлін і падаткаў на суму не меней 1 млн. еўра, а для перавозчыкаў – 200 тыс. еўра. Пры гэтым дзеля таго, каб



Zbornik.indd 15 14.12.2010 23:43:51

трапіць у рэестр мытных прадстаўнікоў, упаўнаважаных эканамічных аператараў, перавозчыкаў, уладальнікаў складоў часовага захавання, прадпрыемствы ці кампаніі ў папярэднім годзе не павінны прыцягвацца да адміністратыўнай адказнасці за мытнае правапарушэнне, чаго складана пазбегнуць у сённяшніх умовах здзяйснення знешнеэканамічнай дзейнасці, асабліва для буйных арганізацый і прадпрымальнікаў.

Як адзначалася вышэй, тэрмін «мытны рэжым» будзе заменены тэрмінам «мытная працэдура». У мэтах мытнага рэгулявання ў дачыненні да тавараў будуць установлены наступныя віды мытных працэдур: 1) выпуск для ўнутранага спажывання; 2) экспарт; 3) мытны транзіт; 4) мытны склад; 5) перапрацоўка на мытнай тэрыторыі; 6) перапрацоўка па-за межамі мытнай тэрыторыі; 7) перапрацоўка для ўнутранага спажывання; 8) часовы ўвоз (допуск); 9) часовы вываз; 10) рэімпарт; 11) рээкспарт; 12) бяспошлінны гандаль; 13) знішчэнне; 14) адказ на карысць дзяржавы; 15) свабодная мытная зона; 16) свабодны склад; 17) адмысловая мытная працэдура. Такім чынам, да дзеючых паводле цяперашняга Мытнага кодэкса Рэспублікі Беларусь мытных рэжымаў будуць дададзены: мытны транзіт, перапрацоўка для ўнутранага спажывання і адмысловая мытная працэдура.

Варта адзначыць інавацыйны характар Мытнага кодэкса МС, у якім утрымліваюцца асобныя главы, што тычацца інфармацыйных тэхналогій і іх прымянення ў мытных органах, сістэмы кіравання рызыкамі, папярэдняга інфармавання, без якіх цяжка ўявіць паўнавартаснае функцыяніраванне Мытнага Саюза ва ўмовах сучаснай сістэмы сусветнага гандлю.

Аднак трэба прызнаць «сыры» характар многіх палажэнняў Мытнага кодэкса МС, падрыхтаванага ў сціслыя тэрміны без актыўнага ўдзелу ў яго абмеркаванні прадстаўнікоў суб’ектаў гаспадарання і бізнес-садружнасцяў. У перамовах па фармаванню прававой базы Мытнага Саюза фактычна не ўдзельнічалі прадстаўнікі галіновых міністэрстваў Рэспублікі Беларусь, у тым ліку ключавога ведамства – Міністэрства эканомікі. Вядучая роля ў перамоўным працэсе належала Міністэрству замежных спраў і Дзяржаўнаму мытнаму камітэту. Як вынік, айчынныя прадпрыемствы і кампаніі не валодаюць поўнай інфармацыяй пра тое, як яны будуць працаваць у новых умовах. У Мытным кодэксе МС Беларусі, Казахстана і Расіі можна назіраць шмат адсылак да нацыянальных заканадаўстваў краін-сябраў Мытнага Саюза, што выклікае праблему эфектыўнага адміністрыравання ў новых умовах на ўзроўні непасрэдных выканаўцаў. Пад загадам нацыянальных заканадаўстваў застаюцца таксама пытанні адміністратыўнага рэгулявання і праваахоўная сфера дзейнасці мытных органаў. У МК МС не прадугледжана наяўнасць органа па вырашэнню спрэчак, якія маюць наднацыянальны характар.

У цэлым, прыняты МК МС для Рэспублікі Беларусь «рэвалюцыйным» назваць цяжка: яго аснову, як і важнейшыя палажэнні Мытнага кодэкса Рэспублікі Беларусь узору 2007 г., складаюць палажэнні Мытнага кодэкса Расійскай Федэрацыі 2003 г. і Кіотскай канвенцыі (у новай рэдакцыі 1999 г.).

Юрыдычнае афармленне Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі не зняла з павесткі дня праблем палітыка-эканамічнага характару. У рамках гэтага рэгіянальнага блока застаецца шмат дэзінтэграцыйных фактараў, у тым ліку звязаныя з асіметрычнасцю створанага аб’яднання, рознасцю палітычных інтарэсаў кіруючых эліт краін-удзельніц Мытнага Саюза (адсутнасць адзінства ў вызначэнні ідэйнага і геапалітычнага ядра еўразійскай інтэграцыі). З аднаго боку, пэўныя колы ў Расіі імкнуцца выкарыстаць еўразійскую ідэю ў сваіх экспансіяніскіх мэтах, з другога – кіраўніцтва Беларусі, Казахстана, цэнтральнаазіяцкіх постсавецкіх краін спадзяюцца атрымаць ад Расіі фінансавую і эканамічную дапамогу, а таксама танную сыравіну для правядзення мадэрнізацыі сваёй прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Адзначым таксама значны ўплыў на працэс фарміравання еўразійскай інтэграцыі знешнепалітычных фактараў. Варта ўлічваць, што ЕўрАзЭС знаходзіцца ў арбіце геапалітычных і эканамічных інтарэсаў ЗША, Еўрасаюзу і Кітая. Акрамя таго, рэалізоўваючы еўразійскі інтэграцыйны праект, таксама неабходна рабіць карэктыроўку на тую сітуацыю на сусветным рынку, якая склалася падчас глабальнага фінансава-эканамічнага крызісу 2008–2010 гг. Гэты крызіс вельмі негатыўна паўплываў на знешні гандаль краін-сябраў Еўразійскай Супольнасці.



Zbornik.indd 16 14.12.2010 23:43:51

Можна канстатаваць, што палітычная складовая інтэграцыя ў рамках Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі значна апярэджвае эканамічную. Больш глыбокай эканамічнай інтэграцыі краін-удзельніц Еўразійскай Супольнасці перашкаджае істотная рознасць у іх эканамічным развіцці, у ступені здзяйснення рынкавых пераўтварэнняў, неўзгодненасць ў пытанні ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю (СГА/ГАТТ), доўгая адсутнасць эфектыўнага наднацыянальнага органа кіравання ў рамках Еўразійскай Супольнасці. Толькі 4 лютага 2009 г. адбылося першае пасяджэнне Камісіі Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі, якая з'яўляецца вышэйшым выканаўчым органам гэтага аб'яднання, упаўнаважанага прымаць у рамках сваёй юрысдыкцыі абавязковыя для выканання краінамі-удзельніцамі Мытнага Саюза рашэнні. Галасы ў КМС размеркаваны наступным чынам: Расійская Федэрацыя – 57%, Рэспубліка Беларусь і Рэспубліка Казахстан – па 21,5% [12]. Адзначым таксама невысокія стартавыя ўмовы для эканамічнай інтэграцыі ў рамках ЕўрАзЭС: нізкі ўзровень унутрыгаліновага гандлю і сыравінную манапалізацыю нацыянальных эканомік (у першую чаргу Расіі і Казахстана), тэхналагічная адсталасць і састарэласць вытворчых фондаў, адсутнасць агульных вытворчых ліній, дэфіцыт транспартных камунікацый, якія патрабуюць кардынальнай мадэрнізацыі. Пры гэтым інтарэсы нацыянальных карпарацый (натуральных манапалістаў), як правіла, не супадаюць з прадэклараванымі мэтамі і задачамі еўразійскай інтэграцыі [4].

У гэтых умовах перад мытнымі органамі дзяржаў-сябраў Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі паўстае няпростая задача вырашэння не толькі чыста ўнутраных, але і знешнепалітычных задач Супольнасці. Дзеля рэалізацыі мэт і задач практычнага ўзаемадзеяння нацыянальных мытных служб у рамках Еўразійскай Супольнасці па асноўных напрамках мытнай палітыкі створаны і функцыяніруе *Савет кіраўнікоў мытных служб пры Інтэграцыйным камітэце ЕўрАзЭС* [5]. Асновай узаемадзеяння мытных структур дзяржаў-сябраў Супольнасці з'яўляюцца ўзгодненыя дзеянні, накіраваныя на уніфікацыю правіл і працэдур мытнага афармлення і мытнага кантролю тавараў і транспартных сродкаў, уключаючы і пытанні свабоднага і роўнага права перасячэння фізічнымі асобамі межаў дзяржаў-удзельніц Мытнага Саюза і бесперашкоднага правозу імі тавараў і валюты, прымяненне адзіных мытных працэдур.

З мэтай удасканалення арганізацыі і функцыяніравання мытных органаў, паляпшэння іх тэхнічнага забеспячэння, развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы, садзейнічання ўдасканаленню мытнай інфраструктуры рашэннем Міждзяржаўнага Савета ЕўрАзЭС у маі 2007 г. зацверджана сумесная мэтавая *Праграма па ўладкаванню пунктаў пропуску на знешніх межах дзяржаў-удзельніц Мытнага Саюза на перыяд 2007–2010 гг.* Рэалізацыя гэтага праекта кантралюецца органамі кіравання інтэграцыяй і штогод разглядаецца на пасяджэннях Інтэграцыйнага Камітэта і Міждзяржаўнага Савета ЕўрАзЭС.

Працэс фарміравання адзінай мытнай прасторы ў рамках Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі актуалізуе пытанне ўзаемадзеяння краін-удзельніц гэтага рэгіянальнага блоку ў галіне падрыхтоўкі кадраў у мытнай сферы, якія б адпавядалі сучасным патрабаванням. Становішча з кадрамі ў краінах-удзельніцах Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі няпростае. На сёння колькасны склад мытнай службы Расійскай Федэрацыі складае каля 56 тыс., Беларусі і Казахстана – прыкладна па 5–6 тыс. чалавек. Павінна быць створана скаардынаваная сістэма падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў на розных узроўнях: першапачатковай падрыхтоўкі або прафесійнай пераарыентацыі асоб з вышэйшай адукацыяй, падрыхтоўка мытных інспектараў, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кіраўнікоў мытных падраздзяленняў і вышэйшага кіруючага складу мытных служб краін-удзельніц ЕўрАзЭС праз вышэйшыя мытныя курсы, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў вышэйшых і сярэдне-спецыяльных навучальных устаноў па мытнай спецыялізацыі, а таксама арганізацыя прафесійнага навучання, якая павінна здзяйсняцца ў падраздзяленнях мытных служб.

Галоўным флагманам у галіне падрыхтоўкі мытнікаў на постсавецкай прасторы застаецца Расійская дзяржаўная мытная акадэмія ў Маскве (РДМА). У яе складзе працуе высокапрафесійны штат прафесараў і выкладчыкаў, Акадэмія і яе аддзяленне ў



Zbornik.indd 17 14.12.2010 23:43:51

Санкт-Пецярбурзе добра забяспечаны ў вучэбна-метадычным і матэрыяльна-тэхнічным плане. РДМА мае шчыльныя сувязі з Сусветнай мытнай арганізацыяй, Еўрамытняй, мытнымі службамі ЗША і Кітая, актыўна ўзаемадзейнічае з міжнароднымі адукацыйнымі цэнтрамі, якія рыхтуюць спецыялістаў для мытнай службы. З 1998 г. Савет Еўропы фінансуе сумесныя еўрапейска-расійскія праекты, дзякуючы якім РДМА і іншыя вучэбныя ўстановы Расіі, якія рыхтуюць спецыялістаў мытнай справы, абнаўляюць свае вучэбныя праграмы, ствараюць новыя мультымедыйныя вучэбна-метадычныя комплексы, развіваюць сістэму дыстанцыйнага навучання, актыўна ўдзельнічаюць у сумесных праграмах па абмену студэнтамі, па арганізацыі навуковых стажыровак для прафесарска-выкладчыцкага складу [16, с. 15]. У 2003 г. на базе РДМА створаны Рэгіянальны вучэбны цэнтр Сусветнай мытнай арганізацыі [11, с. 58].

Нагадаем, што на Расійскую дзяржаўную мытную акадэмію, паводле рашэння Прэзідыума Міждзяржаўнага эканамічнага камітэта краін СНД ад 1 кастрычніка 1997 г., ускладзены функцыі галоўнай навучальнай установы па падрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі кадраў для мытных служб Садружнасці [16, с. 16]. Але палітычны і інстытуцыянальны крызіс СНД, наступствы фінансавага крызісу ў Расіі 1998 г., іншыя прычыны не дазволілі рэалізаваць гэтае рашэнне ў практычную плоскасць. Сёння ў РДМА штогод даюцца квоты на навучанне звыш 100 слухачоў-замежнікаў з краін СНД, Манголіі, Кітая і іншых дзяржаў свету. Толькі адзінкі з іх прадстаўляюць Рэспубліку Беларусь, якія паступаюць сюды вучыцца па мэтаваму накіраванню.

Сітуацыя ў іншых краінах-удзельніцах ЕўрАзЭС у справе падрыхтоўкі кадраў для мытных служб дастакова складаная. Напрыклад, у Беларусі ў 1990-я гг. пры Дзяржаўным мытным камітэце дзейнічаў вучэбны цэнтр па перападрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі мытных кадраў. Падобныя курсы дзейнічалі ў гэты час і пры Інстытуце нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Сітуацыя ў Беларусі ў гэтым пытанні нармалізавалася ў пачатку XXI ст., калі пры Беларускім дзяржаўным універсітэце, Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце, Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту (г. Гомель) былі сфармаваны кафедры мытнай справы, якія пачалі рыхтаваць спецыялістаў мытнай справы. Можна канстатаваць, што дагэтуль у рамках ЕўрАзЭС не вырашана задача па стварэнню агульнай інфармацыйна-прававой базы і адзінай інфармацыйна-вучэбнай прасторы ў справе падрыхтоўцы мытнікаў.

Асаблівую актуальнасць у сферы міжнародных адносін набываюць пытанні *абароны правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці*, звязаныя з правядзеннем мерапрыемстваў па недапушчэнню ўвозу на тэрыторыю Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі кантрафактнай прадукцыі. Меры, накіраваныя на абарону правоў інтэлектуальнай уласнасці, будуць садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці механізма мытнага кантролю тавараў, утрымліваючых аб'екты інтэлектуальнай уласнасці. Гэта дазволіць зблізіць стандарты па абароне інтэлектуальнай уласнасці. Першыя практычныя крокі ў гэтым напрамку зроблены. Саветам кіраўнікоў мытных служб пры Інтэграцыйным Камітэце ЕўрАзЭС прыняты рэгламент і фармат дадзеных аб аб'ектах інтэлектуальнай уласнасці, якія дзейнічаюць у мытных службах дзяржаў-удзельніц Еўразійскай Супольнасці [10, с.156].

У мэтах павышэння эфектыўнасці двухбаковага і шматбаковага супрацоўніцтва праз удасканаленне абмену інфармацыяй праваахоўнага характару пад эгідай СМА/СМС у верасні 2001 г. у адпаведнасці з рашэннем кіраўнікоў мытных служб краін СНД (Дырэктыва № 7/32 ад 13 верасня 2001 г.) і па дамоўленасці з СМА/СМС быў створаны *Рэгіянальны вузел сувязі па праваахоўнай працы «RILO Масква»*. Усе мытныя службы дзяржаў-сябраў ЕўрАзЭС актыўна ўзаемадзейнічаюць з ім. Наладжаны абмен дадзенымі з нацыянальнымі вузламі сувязі Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кіргызстана, Расіі, Таджыкістана, з іншымі краінамі СНД па фактах затрымання кантрабанды, незаконнага правозу наркоцікаў, зброі, боезапасаў і выбуховых рэчаў [6].

Даволі плённа наладжваюцца стасункі ЕўрАзЭС, Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі са Сусветнай мытнай арганізацыяй. Узаемная зацікаўленасць бакоў у забеспячэнні якаснага мытнага абслугоўвання грузавых і пасажырскіх патокаў, уніфікацыі мытных дакументаў, правіл і працэдур садзейнічала падпісанню 25 чэрвеня 2004 г. Мемарандума



Zbornik.indd 18 14.12.2010 23:43:52

аб узаемапаразуменні паміж СМА/СМС і ЕўрАзЭС. Дадаткова было дамоўлена, што СМА/СМС будзе аказваць ЕўрАзЭС дапамогу ў распрацоўцы мытнага заканадаўства краін-удзельніц Супольнасці, а таксама іншых нарматыўна-прававых актаў, для прывядзення іх у адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі і практыкай СМА/СМС [10, с. 172].

Пры фарміраванні адзінай мытнай тэрыторыі дзяржавы-удзельніцы Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі сутыкнуліся з шэрагам сур'ёзных праблем па ўладкаванню знешніх мытных меж Супольнасці (занядбаная інфраструктура, незадавальняючае тэхнічнае забеспячэнне, непрадуманасць і некампактнасць размяшчэння пунктаў пропуску), што выклікае іх перагружанасць і нізкую прапускную здольнасць. Гэта ў сваю чаргу не садзейнічае дзейснаму прадухіленню і папярэджванню найбольш небяспечных мытных правапарушэнняў – кантрабанды, незаконнага ўвозу наркотыкаў, псіхатропных рэчаў, зброі і г.д. Ва ўмовах адкрытасці ўнутраных меж краін-сяброў Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі такое становішча нясе пагрозу нацыянальнай бяспецы названых дзяржаў [7].

Нягледзячы на значныя зрухі ў справе мытнага супрацоўніцтва дзяржаў-удзельніц еўразійскай эканамічнай інтэграцыі ў мытнай справе належыць яшчэ шмат зрабіць для павышэння эфектыўнасці і скаардынаванасці працы мытных служб ЕўрАзЭС. Прынамсі трэба:

- максімальна уніфікаваць прававую базу ў мытнай сферы;
- стварыць адзіную аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму мытных служб ЕўрАзЭС;
- спрасціць мытнае афармленне і мытны кантроль на ўнутраных мытных межах з далейшай адменай мытнага афармлення і асобных форм мытнага кантролю ў рамках адзінай мытнай прасторы на завяршальным этапе фарміравання Мытнага Саюза, пры забеспячэнні надзейнага мытнага кантролю на знешніх граніцах інтэграцыйнага аб'яднання;
- правядзенне мер па максімальнаму змяншэнню адміністратыўных функцый мытных органаў, спрашчэнню мытнага афармлення, забеспячэнню высокай эфектыўнасці мытнага кантролю;
- мытным адміністрацыям дзяржаў-сяброў Еўразійскай Супольнасці прызнаваць вынікі дагляду тавараў мытнымі органмі краіны адпраўлення пры здзяйсненні мытнага афармлення і кантролю ў мытных органах краіны прызначэння тавараў і транспартных сродкаў без правядзення дадатковых працэдур мытнага дагляду на межах дзяржаў-удзельніц Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі;
- укараненне працэдуры папярэдняга электроннага дэкларавання ў пунктах пропуску на знешніх межах Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі, пры гарманізацыі патрабаванняў у дачыненні да папярэдняга электроннага паведамлення;
- ажыццявіць пераход ад кантроля тавараў да контролю інфармацыі аб таварах (аддзяліць таварапатокі ад звароту суправаджальных дакументаў);
- здзейсніць пераход на электронны (беспапяровы) зварот дакументацыі як у сферы мытных працэдур і мытнага кантролю, так і ў сферы арганізацыі кіравання ў мытных органах;
- распрацаваць адзіны парадак і правілы ў дзяржавах-сябрах Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі звароту сум мытных плацяжоў, прадстаўлення адтэрміноўкі і растэрміноўкі ўплаты мытных плацяжоў, мытнага афармлення тавараў, якія падлягаюць спецыяльнай маркіроўцы, кантролю за таварамі, у дачыненні да якіх прадстаўляюцца тарыфныя і падаткавыя ільготы;
- мытным службам наладзіць і развіваць партнёрскія ўзаемаадносіны з прадпрымальніцкай супольнасцю, з бізнес-садружнасцямі і іншымі зацікаўленымі арганізацыямі;
- не дапушчаць несанкцыяніраванага рээкспарту ў трэція краіны;
- здзяйсняць сумесныя меры па барацьбе з кантрабандай;
- забяспечыць адназначную ідэнтыфікацыю транспартных сродкаў, кіроўцаў транспартных сродкаў, атрымальнікаў тавараў у мэтах пошуку і выяўлення іх у выпадку недастаўкі тавараў у мытныя органы;
- працягнуць працу па рэалізацыі Праграмы ўладкавання пунктаў пропуску на знешніх межах Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі;
- удасканаліць сумесную працу па падрыхтоўцы высокапрафесійных кадраў у мытнай сферы [5; 6; 7; 10, с. 139–141].



Zbornik.indd 19 14.12.2010 23:43:52

Адной з характэрных асаблівасцей сучаснага перыяду развіцця мытных служб у свеце з'яўляецца ўкараненне *сістэмы кіравання рызыкамі (СКР)* у механізмы мытнага кантролю. Для краін-сяброў Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі застаецца актуальнай задача ўкаранення СКР не толькі ў нацыянальныя сістэмы мытнага кантролю, але і ў схемы ўзаемадзеяння на міждзяржаўным узроўні па прадухіленню і нейтралізацыі «агульных» рызык. На сённяшні дзень СКР найбольш развіта ў Расійскай Федэрацыі. Менавіта Расія ў рамках ЕўрАзЭС стала ініцыятарам стварэння *Канцэпцыі сістэмы кіравання рызыкамі*, якая Саветам кіраўнікоў мытных служб пры Інтэграцыйным Камітэце ЕўрАзЭС была рэкамендавана для выкарыстання ў дзяржавах Супольнасці [9].

Сутнасць прымянення *сістэмы аналізу рызык* заключаецца ў мэтанакіраваным кантролe тавараў, якія праходзяць мытнае афармленне. Мэтанакіраванасць дасягаецца шляхам вызначэння тавараў (партый, транспартных сродкаў, кантэйнераў і г.д.), прадстаўляючых найбольшую ступень рызыкі. Укараненне *сістэмы аналізу рызык* дазваляе значна зменшыць час правядзення мытнага кантролю, што будзе садзейнічаць росту таваразвароту, змяншэнню выдаткаў на мытнае афармленне, павысіць эфектыўнасць мытнага кантролю (мінімізацыя «чалавечага фактара» пры яго правядзенні).

Сёння існуе неабходнасць стварэння адмысловага падраздзялення пры Савеце кіраўнікоў мытных служб ЕўрАзЭС, на якое патрэбна ўскласці абавязкі па маніторынгу і аналізу рызык, маючых транспамежны характар і аказваючых негатыўнае ўздзеянне на эканамічныя працэсы ў краінах Еўразійскай Супольнасці. Гэтыя структуры павінны ўзяць на сабе абавязак распрацоўкі характарыстык рызык і аператыўнай каардынацыі дзейнасці цэнтральных мытных органаў у ЕўрАзЭС [10, с. 190].

**Заключэнне.** Стварэнне Мытнага Саюзу Беларусі, Казахстана і Расіі для эканамічнага развіцця Беларусі патэнцыйна нясе за сабой як станоўчыя, так і негатыўныя наступствы. Удзел у гэтым міждзяржаўным пагадненні забяспечвае для краіны ў бліжэйшай перспектыве спрыяльныя ўмовы для свабоднага перамяшчэння беларускіх тавараў на рынках Расіі і Казахстана, дае магчымасць па-ранейшаму атрымліваць расійскія энерганосьбіты па танных коштах. З пачатку ліпеня 2010 г. у рамках адзінай мытнай прасторы любы тавар, зроблены на гэтай тэрыторыі, атрымлівае статус тавара Мытнага Саюза і зможа бесперашкодна перамяшчацца ад Брэста да Уладзівастока, незалежна ад ступені ўдзелу ў яго вытворчасці замежных кампенентаў, што прыцягне ў краіну новых інвестараў, якія змогуць рэалізоўваць свае бізнес-праекты не толькі ў межах нацыянальнага рынку, але на рынку ўсяго Мытнага Саюза. Пры ўзнікненні магчымых праблем на сусветных рынках, справакаваных, напрыклад, палітычнымі прычынамі, краіны-удзельніцы Мытнага Саюза змогуць кансалідавана выступіць у абарону сваіх эканамічных інтарэсаў. У дадзеных умовах Беларусь, каб абараніць свой экспарт, зможа абаперціся на моцную дыпламатычную падтрымку Расіі і Казахстана. Узросшая канкурэнцыя сярод таваравытворцаў у межах адзінай мытнай прасторы патэнцыяльна павінна спрыяць павышэнню эфектыўнасці і рэнтабельнасці нацыянальнай эканомікі Беларусі. У перспектыве гэта можа дапамагчы Беларусі з меншымі выдаткамі і рызыкамі для ключавых галін народнай гаспадаркі адаптавацца да правіл гульні на сусветным рынку пасля ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю.

Але, з другога боку, цяплічныя ўмовы існавання айчынных вытворцаў пры нізкіх цэнах на расійскія энерганосьбіты і сыравіну, наадварот, будуць стрымліваць працэс інтэнсіфікацыі эканамічнага развіцця, замаруджваць перавод народнагаспадарчага комплексу на рынкавыя рэйкі і не дазволяць у хуткія тэрміны завершыць мадэрнізацыю нацыянальнай эканомікі. А гэта вельмі важна для краіны, якая жыве за кошт экспарту сваёй прадукцыі. Яўная асіметрыя Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі (эканамічнае і дэмаграфічнае дамінаванне Расіі, якая не адмовілася ад сваіх экспансіяніцкіх мэт у дачыненні да сваіх суседзяў па былому Савецкаму Саюзу), штучная эканамічная арыентацыя ў першую чаргу на расійскі рынак, адсутнасць разумнай дыверсіфікацыі знешнегандлевых сувязяў нясе вялікую пагрозу нацыянальнай бяспецы краіны і можа прывесці да страты суверэнітэту. Такую занепакоенасць выказаў 17 лістапада 2009 г., падчас пасяджэння беларускага ўрада, напярэдадні падпісання міждзяржаўных



Zbornik.indd 20 14.12.2010 23:43:52

дакументаў па стварэнню Мытнага Саюза Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка: «Скажу наўпрост, мяне непакоіць, ці дастаткова абаронены і цалкам улічаны беларускія эканамічныя і знешнепалітычныя інтарэсы на этапе ўзгаднення ўмоў Мытнага Саюза... Расія і Казахстан у чымсьці падобныя адзін на аднаго, паколькі ў іх ёсць галоўнае – вугле-вадародная сыравіна. Наша эканоміка зусім іншая… Тут мы са сваёй эканомікай можам застацца сам на сам... Складваецца ўражанне, што мы пайшлі па шляху найменшага супраціву, саступаючы свае пазіцыі і не атрымліваючы нічога прадметнага ўзамен, акрамя завярэнняў і абяцанняў… Мы ведаем, як гэтыя завярэнні рэалізоўваюцца… Зноў жа, як ужо не раз бывала, мы своечасова не дбаем пра абарону нашых нацыянальных інтарэсаў. Ці зможам мы кампенсаваць упушчаныя выгады ад супрацоўніцтва з трэцімі краінамі, уступаючы ў Мытны Саюз, сфарміраваны пераважна на ўмовах расійскага боку? Вы павінны разумець, што любая памылка, любы пралік тут будзе вельмі дорага каштаваць краіне і народу» [17]. Дадатковых каментарыяў тут не патрэбна. Час расставіць свае акцэнты ў гэтым пытанні.

Негатыўныя наступствы ўваходжання Рэспублікі Беларусь у Мытны Саюз палягаюць і ў Адзіным мытным тарыфе Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі. «Гарманізацыя мытных пошлін» пацягне за сабой павышэнне коштаў на замежныя аўтамабілі на ўнутраным рынку краіны. Магчыма таксама паступленне «шэрага» імпарту па дэмпінгавых цэнах, які будзе бесперашкодна паступаць праз Расію. Няма поўнай гарантыі, што ва ўмовах Мытнага Саюза Расія зноў не выкарыстае ў палітычных мэтах нетарыфныя меры дзеля абмежавання беларускага экспарту на свой рынак, як гэта было летам 2009 г., падчас т.зв. «малочнай вайны».

На сёння многія айчынныя прадпрыемствы не здольны на роўных канкурыраваць з расійскімі кампаніямі пры адкрытых мытных межах. Гэта можа прывясці да росту банкруцтваў і беспрацоўя ў краіне. Мінімізаваць гэтыя негатыўныя наступствы дапаможа правядзенне дэбюракратызацыі і лібералізацыі эканомікі.

Супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне ў сферы мытнай справы з'яўляюцца важнейшымі фактарамі па садзейнічанню фарміравання адзінай эканамічнай прасторы ў рамках Мытнага Саюза Беларусі, Казахстана і Расіі. Гэтаму будзе садзейнічаць узмацненне каардынацыі дзейнасці мытных органаў краін-удзельніц Мытнага Саюза, павышэнне выніковасці ключавых элементаў сістэмы мытнага кантролю, дзякуючы ўкараненню ў дзейнасць мытных органаў сістэмы кіравання рызыкамі, спрашчэнню мытных працэдур, аўтаматызацыі мытных тэхналогій.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Договор об учреждении Евразийского экономического сообщества от 10 октября 2000 г. (с изменениями от 25 января 2006 г. и 6 октября 2007 г.). — [Электронный ресурс] — Дата доступа: 01.11.2008. — Режим доступа: http://www.pravo.by

2. Постановление Бюро Межпарламентской Ассамблеи Евразийского экономического сообщества от 17 ноября 2005 г. №2 «Об итогах межпарламентских слушаний «Вопросы сближения (унификации) таможенных законодательств государств–членов ЕврАзЭС: опыт, проблемы, перспективы». — [Электронный ресурс] — Дата доступа: 05.03.2009. — Режим доступа: http://www.evrazes.com/ru/main/documentpage/13

3. Истомин, С.И., Таможенный союз стран ЕврАзЭС (комментарий в документах) / С.И.Истомин, Я.И.Моравек. — Москва: «Экономика» 2004. — 270 с.

4. Караваев, А.В. Кризис развития и целей ЕврАзЭС / А.В.Караваев. — Информационно-аналитический центр. [Электронный ресурс] — Дата доступа: 02.02.2009. — Режим доступа: http://www.ia-centr.ru

5. Карогозян, А.Л. Основные направления развития ЕврАзЭС на ближайшее десятилетие. Автореферат кандидатской диссертации… / А.Л.Карогозян. — Москва: РИО–РТА, 2007.— 17 с.

6. Конопляников, П. Таможенный союз: реалии сегодняшнего дня / П.Конопляников // Таможня и ВЭД (Минск), 2008.— №12.— С. 7–9.



Zbornik.indd 21 14.12.2010 23:43:52

7. Костик, Е.И. Развитие таможенного сотрудничества государств-членов ЕврАзЭС. Автореферат кандидатской диссертации… /Е.И.Костик. — Москва: РИО–РТА, 2007. — 17 с.

8. Маненок, Т. Прагматичный выбор /Т. Маненок // Белорусы и рынок. 2009, 22 ноября. [Электронный ресурс] — Дата доступа: 22.11.2009. — Режим доступа: http://www.belmarket.by/ru/52/30/3968/

9. О первоочередных задачах развития таможенного сотрудничества государств-членов ЕврАзЭС // Экономика XXI века (Москва). — 2008. — № 8. — С. 7–11.

10. Повышение эффективности таможенного контроля на основе совершенствования таможенных технологий // Сборник материалов научно-практической конференции. — М. — РИО–РТА, 2005. — 221 с.

11. Рапота, Г.А. ЕврАзЭС: экономическое притяжение / Г.А.Рапота, С.Д.Примбетов, Г.Р.Исламова, О.Р.Григорьев. — Москва, 2005. — 221с.— [Электронный ресурс] — Дата доступа: 07.03.2009. — Режим доступа: www.evrazes.com/ru/main/documentslistpage/2 (оффициальный сайт ЕврАзЭС).

12. www.evrazes.com (афіцыйны сайт ЕўрАзЭС. Інфармацыйна-аналітычны рэсурс Адзінай эканамічнай прасторы).

13. www.interfax.by (інфармацыйна-даведачны партал Рэспублікі Беларусь).

14. www.gtk.gov.by (афіцыйны сайт Дзяржаўнага мытнага камітэту Рэспублікі Беларусь).

15. www.m-economy.ru (оффициальный сайт «Евразийского международного научно-аналитического журнала»).

16. Стенограмма парламентских слушаний Комитета Совета Федерации по делам Содружества Независимых Государств на тему: «Таможенный союз Белоруссии, Казахстана, Киргизии и России: проблемы становления и развития» // Аналитический вестник Совета Федерации. Москва, 1998. — №1. — С. 5–37.

17. Лукашенко сомневается, достаточно ли учтены интересы Беларуси на этапе согласования условий Таможенного союза // БЕЛТА. Политика. 2009, 17 ноября. — Режим доступа: http://news.tut.by/economics/14701.html — Дата доступа: 17.12.2009.

## Аннотация

**Ляховский В., Сашина О. Становление Таможенного союза Беларуси, Казахстана и России в рамках Евразийского Экономического Содружества (статья). – Минск, 2009.**

Статья посвящена различным аспектам формирования Таможенного союза Беларуси, Казахстана и России, который был юридически оформлен в ноябре 2007 г. Авторы подробно рассматривают проблемы формирования Единого таможенного тарифа и меры нетарифного регулирования внешней торговли. Анализируются нововведения в Таможенном кодексе Таможенного союза ЕврАзЭС. Подробно освещены различные вопросы взаимодействия таможенных служб участников названного регионального интеграционного блока в новых условиях. Также затронуты проблемы политико-экономического характера, стоящие на пути более глубокой интеграции на евразийском геопространстве.

## Annotation

***Uladzimir* Liakhovski, *Volga* Sashyna. Formation of the Customs union of Belarus, Kazakhstan and Russia within the limits of the Euroasian Economic Community (article). – Minsk, 2009.**

The article is devoted to various aspects of the formation of the Customs union of Belarus, Kazakhstan and Russia which has been legalized in November 2007. The authors examine in detail the problems of formation of the uniform custom tariff and non-tariff measures of regulation of foreign trade. Innovations in the Customs code of the Customs union EurAsEC are analyzed. Various questions of cooperation in new conditions of customs services of the participants of the named regional integration block are taken up. The political and economical problems standing on a way of deeper integration on the Euroasian geospace are also mentioned.



Zbornik.indd 22 14.12.2010 23:43:53